Гонарам і славай беларускай зямлі з’яўляецца найбуйнейшы майстар слова, выдатны асветнік, філосаф і прамоўца, першы епіскап Тураўскай епархіі, адзін з высокаадукаванейшых людзей свайго часу Кірыла Тураўскі. Творы Кірылы Тураўскага склалі залаты фонд старажытнарускай літаратуры і на працягу стагоддзяў карысталіся вялікай папулярнасцю на землях усходніх славян, перапісваліся да XIX ст. Яны змяшчаліся ў зборніках-анталогіях "Златоуст" і "Торжественник" побач з класічнымі ўзорамі антычнай аратарскай прозы, творамі Іаана Златавуста.

23 верасня, у чацвер, вучні 9 класа падрыхтавалі міні-праекты, прысвечаныя выдатнаму асветніку Тураўскаму. Вучні расказалі, які вялікі ўклад зрабіў майстар слова ў развіццё нашай мовы і культуры. Таксама дзеці падрыхтавалі вельмі цікавыя і змястоўныя праекты пра сучасных майстроў роднага слова, асобныя старонкі развіцця беларускай літаратуры і кнігадруку.

Настаўніца беларускай мовы і літаратуры Кайданава В.В.



